Віктар Гардзей

# ЗАЙ, ЯКІ ЛІЧЫЎ ВАРОН



**Віктар Гардзей**

# ЗАЙ, ЯКІ ЛІЧЫЎ ВАРОН



Вершы, небыліцы, пацешкі

МІНСК
«ЮНАЦТВА»
1991

ББК84Бел7
Г20

Рэдактар выдавецтва У. І. КАРЫЗНА

Мастак В. І. ВАЛЫНЕЦ

В новой книге поэта собраны стихи, небылицы, потешки о зверях и птицах, о живописной белорусской природе. Многие из них написаны с юмором.

Г $\frac{4803120202-053}{М307(03)-91}$ 38—91

ISBN 5-7880-0529-9

© В. К. Гардзей, 1991
© Ілюстрацыі. В. І. Валынец, 1991



## *ЖАБІНЫ КАНЦЭРТЫ*

Жабы ўвесну ажылі
І канцэрты пачалі.

Надвячоркам гвалт і шум:
Ква-ква-ква! Корч-корч! Крум-крум!

Абураецца трытон:
— Сапсуюць, крыкухі, сон!

— Хай пяюць хоць сяк, хоць так,—
Да суседзяў кажа рак.

На канцэрт жа па вадзе
Чарада буслоў ідзе.

Жабы ў рэчку — шабулдых!
І адразу брод заціх.

## *МАЛОЧНЫ ТУМАН*

Вербалозы і ракіты
Зеляненюць над вадой.
У нізках туман разліты —
Белы, быццам сырадой.

Малако туманных раніц
Сонца п'е каля ракі,
І таму ў яго румянец
Не сыходзіць са шчакі.



## *ЯШЧАРКА*

Воўк цераз балотца бег наўпрост,
Наступіў ён яшчарцы на хвост.

Пад нагою тут пачуўся хруст —
Яшчарка рванулася пад куст.

Са здзіўленнем крыкнуў воўк стары:
— Хвост, які зламаўся, забяры!

— Не дуры мне, шэры, галавы! —
Яшчарка адказвае з травы.—

У мяне цяпер, каб ведаў ты,
Вырастуць два новыя хвасты.



### *ЛЯСНЫЯ ПАРАСЯТЫ*

Спалі ўвесну парасяты
У піжамках паласатых.

Тут заціндзенькалі сініцы:
— Лечаць бедных у бальніцы!

Беглі ўлетку парасяты
Без піжамак паласатых.

Зноў заціндзенькалі сініцы:
— Выпісалі ўжо з бальніцы!



## *ПРАЛЕСКІ*

На выспы і на ўзлескі,
На сонечны прыгрэў
Разбегліся пралескі
З-пад азалелых дрэў.

Набраклі сокам клёны.
Пах кружыць галаву.
Спусціўся дождж зялёны
На лес і на траву.

Тут ранкам урачыстым
Затрубіць лось у рог.
Блакітна ў небе чыстым.
Блакітны мокры лог.

Пралескамі з ахвотай
Любуюцца вясной —
Іх вабнаю пяшчотай,
Іх дзіўнаю красой.

І там, і тут усплёскі
Блакітнага святла,
І ўжо на ўзлесак з вёскі
Кіруецца пчала.

## *МУДРЫ ВОРАН*

Воран, што пражыў гадоў за дзвесце,
Стомлена ў садку прысеў на сук.
— Прэч адсюль! Благія носіш весці,—
Замахнуўся на яго хлапчук.

— Разумнейшы твой дзядок сівенькі,—
Мудры воран хлапчуку сказаў.—
Помніцца, калі ён быў маленькі,—
Камянямі ў птушак не кідаў.



## *ЖУРАЎЛІНЫ «БУДЗІЛЬНІК»*

***Легенда***

Лес прасвятлеў пасля бур і мяцеліц,
З выраю птушкі ўгары праплылі.
Цяжка ляцелі да родных аселіц —
Хочуць крыху адпачыць жураўлі.



Селі за рэчкай у сонным здранцвенні,
Сам жа важак сцеражэ чараду.
Чуйна ён слухае пошум вясенні,
Птушак разбудзіць, пачуўшы бяду.

Сторах не дасць жураўлёў на загубу,
Спаць яму нельга — такі ўжо закон.
Жораў стары бярэ камень у дзюбу:
Як ні мацуйся, адольвае сон.

Доўга ж ляцеў праз далёкія землі,
Помніць заўжды, перад кім у даўгу.
Дзюба панікне, ледзь жораў задрэмле,
Камень балюча ўпадзе на нагу.

Стораж прахопіцца, камень падыме,
Будзе зноў пільна стаяць на пасту.
Даль у зялёным хаваецца дыме,
Ціша навокал — чуваць за вярсту.

Ёсць у прыроды адвечныя тайны.
Клін жураўліны прапаў за смугой.
Кажуць, «будзільнік», такі незвычайны,
Жораў і ў выраі носіць з сабой.

## *ПАЛЁТ ШЧУПАКА*

Тузануўся паплавок
І паплыў, паплыў убок.

Вудачку рвануў рыбак —
Вылецеў з вады шчупак,

Апісаў сабой дугу,
Сонца ўбачыў і смугу,

Сіні ўбачыў небасхіл,
Ды на больш не стала сіл —

У траву бядак упаў
І хвастом затрапятаў...

У жыцці бывае так,
Што лятае і шчупак.



## ЗМЯЯ І ВОЖЫК

Змяя, віхляючы, ліняла —
Убор паношаны мяняла.
Рывок усёй мускулатуры,
І — выпаўзла яна са скуры.
У верасе між дзвюх дарожак
На выпаўзак натрапіў вожык.
— Змяі, відаць, задаў я страху,
Калі згубіла апранаху.



## *СОКАЛ*

На палетку з-за аблокаў
Асачыў здабычу сокал.

І ля норкі хамяковай
Ён упаў невыпадкова.

— Ты адкуль? — хамяк здзівіўся.—
Ці не з неба ты зваліўся?

— Як даведаўся, блазнота?
— Жах, як ты высока лётаў!

Сокал глянуў на аблокі,
А хамяк тады — наўцёкі.

З норкі крыкнуў: — Гэта ж трэба
Разяваку ўпасці з неба!



## *ХІТРЫ ЛІС*

Ліс з нары сваёй уранні
Выбраўся на паляванне.

Бег па зайчыкавым следзе,
Ды нарваўся на мядзведзя.

Той зароў: — Хто сон парушыў?
Накручу як бачыш вушы!

Кажа ліс яму ўжо з хмызу:
— Першым заяц бег паблізу.

— Прывядзі ты мне касога —
Пакараю вельмі строга.

Ліс, падумаўшы, з-за хвояў
Мішку тут жа супакоіў:

— Зайцу, што твой сон парушыў,
Накручу і сам я вушы.

## ЛАСІ

На ўзлеску — сляды ласіныя:
Ішлі да ракі сахатыя
Уранні густым асіннікам,
Што стаў ім утульнай хатаю.

Ішлі ласі — не спяшаліся —
Адною дружнай сямейкаю.
Ішлі, на хаду ласаваліся
Асінак лістотай клейкаю.

Ішлі, а пасля, асцярожныя,
На ўзлеску ласі спыніліся.
Напэўна, лугі мурожныя
Таптаць яны не рашыліся.



## БУСЕЛ І КАНЯ

Неяк на лужок зраселы
Апусціўся бусел белы.

Доўга ён глядзеў на травы,
Не мяняючы паставы.

Ка́ня блізка пралятала
І буслу паспачувала:

— Ці пагода, ці нягоды,
На нагах стаіш заўсёды.

Наўздагонку вузкачубай
Бусел моцна ляснуў дзюбай:

— Як ты, каня, насмяшыла!
Хто ж калі стаяў на крылах?



## *КРЫЎДА АСАЕДАЎ*

Сёння ў асаедаў свята:
З яек выйшлі птушаняты.

Сын пытае самы бойкі:
— Хто мы — попаўзні ці сойкі?

— Тыя птушкі не такія —
Асаеды вы лясныя.

Ледзь з’явіўшыся на свеце,
Папракнулі маму дзеці:

— Восаў мы яшчэ не елі,
А зняславіць нас паспелі.



## *ПУГАЧ*

Ледзь сутоніцца крыху,
Чуецца: «У-ху! У-ху!»

Гэтак вухкае пугач —
Страх усіх бярэ, хоць плач.

Зноў ад голасу савы
Бедны заяц ледзь жывы.

І жукі, і павукі
Распаўзаюцца ў бакі.

Нават лось паджгаў наўскач —
Так спужаў яго пугач.

## *САРАКАНОЖКА*

Мама як пасцель мяняла,
Дык дачушку павучала:

— Не памыўшы, дзетка, ножак,
Не кладзіся ў чысты ложак.
Апусціўся вечар хутка —
У слязах сядзіць малютка.
Трэба ж, каб пусцілі ў ложак,
Беднай мыць аж сорак ножак!



## *ШУРА І КУРЫ*

Шура, хлопец самавіты,
Змайстраваў курам карыта.
Дзірак толькі ў ім багата,
І карыта зганіў тата:
— Дзіркі гэтыя ад спеху,
Вось курам дзе будзе смеху!
— Ты жартуеш? — кажа Шура.—
Не смяюцца нашы куры.

## *АНЮЦІНЫ КВЕТКІ*

Гадаюць на лузе
Вясёлыя дзеткі,
Якія ў Анюты
Любімыя кветкі:
— Пралескі!
— Фіялкі!
— Рамонкі!
— Званочкі!
А мама смяецца:
— Анюціны вочкі!



## *ГУСАЧОК*

Гусачок гультаяваты
Блізка ходзіць каля хаты.

Траўку жоўтую шчыпае
І так хітра разважае:

— Паглядзяць, што я не сыты,
Дык нальюць яды ў карыта.

Гаспадар жа ад парога
Гусачка прагнаў малога:

— Прэч, хітрун! Вунь ля канаўкі
Многа зелянейшай траўкі.



## *ЛЕЎ*

Ехаць раніцай сабраўся
Да сваіх знаёмых леў.
Так спяшаўся, так спяшаўся,
А на поезд не паспеў.

Выцер лоб і выцер спіну,
Ды не стаў сябе караць:
— Не спазніўся ж на гадзіну,
А ўсяго мінут на пяць.



## ЗАЙЧЫКАВЫ НОТЫ

У музычнай школе
Зайчык дзень прабыў.
— До-Рэ-Мі — фасоля! —
Ноты ён вучыў.

Потым ля загона
Рваў струкі за трох
І спяваў натхнёна:
— До-Рэ-Мі — гарох!

## У ЛЯСНЫМ МАГАЗІНЕ

Прадаўцом казёл наняўся,
Дык адразу і зазнаўся.

На прылаўках магазіна
Толькі пух ляжыць казіны.

Лось пытае: — Што, дарэчы,
Прадаеш яшчэ, старэча?

Буркнуў тут казёл патлаты:
— Дурняў прадаю рагатых.

— Добры ж торг,— лось засмяяўся,—
Калі ты адзін застаўся!



## *ХВОРЫ КОЦІК*

Ціха стогне бедны коцік —
Забалеў яму жывоцік.

Хлеб гарэлы еў з каморы,
Дык, відаць, таму стаў хворы.

Строгі доктар сярод ночы
Небараку лечыць вочы.

— А нашто? — спужаўся коцік.—
У мяне ж баліць жывоцік.

— Ах, які незразумелы:
Каб не еў больш хлеб гарэлы!



## КАЗА

Казёл казе на імяніны
Прынёс чырвонай канюшыны.

Каза не ўцешыцца ад ласкі:
— Якія свежанькія краскі!

— Каб не завянулі, адразу
Пастаў іх, мілая, у вазу.

Каза з дакорам паглядзела
І канюшыну тут жа з'ела.



## *ЗАЙ, ЯКІ ЛІЧЫЎ ВАРОН*

З хаткі выбег зай вучоны
І варон лічыць пачаў:
— Дзве вароны... Тры вароны...
Спатыкнуўся зай і ўпаў.

Рагаталі нават совы:
— Недарэка з недарэк!
Зай упаў на корч яловы
І губу сабе рассек.

Звалі доктара сарокі,
Ды ў ад'ездзе доктар быў.
Небарака ж касавокі
Рану кепска залячыў.

У сябе над галавою
Зай не лічыць больш варон,
Бо з раздвоенай губою
І сягоння ходзіць ён.



## *МУРАШЫНЫЯ КАРОЎКІ*

Любяць мурашы дастатак:
Ёсць у іх свой дойны статак.

З мурашамі ў добрай згодзе
Тля жыруе на выгодзе.

Тлю і кормяць, тлю і пояць,
І яе ж за гэта дояць.

Тлю мураш бліжэй пакліча
І вусамі паказыча.

Даяра за ласку тую
Малачком яна частуе.

Вельмі шчодрыя кароўкі —
Мурашыныя сяброўкі.



## *КАЖАН*

Ціш начная ў гушчары:
Спяць і птушкі, і звяры.

Кажану ж, наадварот,
Ноччу хочацца ў палёт.

Чуе ў цемры кожны гук,
Не напорацца на сук.

Раніцай апаў туман.
Засынаць пачаў кажан.

Паглядзіце, як ён спіць:
Галавой уніз вісіць.

Будзе просьба тут адна:
Не будзіце кажана!



## ГЛУШЦОВЫЯ ПРЫСМАКІ

Глушэц каменьчыкі глытае,
Глушца лясны жаўрук пытае:
— Скажы, ці шмат ад іх карысці?
Шукаў бы чарвякоў у лісці.

Глушэц матляе галавою:
— Люблю я каташкі і хвою.
Калі ж дабаўлю галькі свежай,
Дык лепш засвойваецца ежа.

Глушца жаўрук карае строга:
— Каменьчыкаў не еў бы многа,
Бо ад цяжару, што глытаеш,
Зусім жа нізка ты лятаеш.

## У ГАСЦЯХ

Мядзведзь прыходзіць да лісіцы:
— Хутчэй частуй мяне, кума.
Ды ў хаце голыя паліцы —
Ні цукру, ні мукі няма.

Стаіць на кухні печ пустая.
Не будзе ж мішка грызці косць.
— Ты еў бы мёд? — кума пытае.
— Канечне, еў бы! — кажа госць.

І непадроблена з адчаю
Лісіца пачала ўздыхаць:
— Што еў бы мёд — я гэта знаю,
Ды дзе табе яго мне ўзяць?



## *ЦЯРПЛІВЫ ПЕВЕНЬ*

Невыносныя з паўдня
Спёка, млосць, гарачыня.

Качар енчыць: — Не магу,
На раку я пабягу.

І гусак пішчыць: — Пайду,
Скокну з берага ў ваду.

Толькі певень на раку
Не спяшаецца з цяньку:

— Лепш за плотам пасяджу,
Дачакаюся дажджу.



## *ЧАРАПАХА*

Цераз бор, што ў ззянні медзі,
На машыне зайчык едзе.

Едзе, песеньку спявае,
Чарапаху даганяе.

— Лезь, маруда, на машыну,
То да горада падкіну.

— Лезці часу я не маю —
Вельмі ж на базар спяшаю.



## *САРОЧЫНА БАГАЦЦЕ*

Ранкам на сасне высокай
Выхвалялася сарока:
— Я багацця многа маю —
Розны скарб даўно збіраю.
У гняздзе ёсць бранзалетка
І сярэбраная кветка.
Ёсць тры лыжкі, ёсць іголкі,
Ёсць бліскучыя асколкі
Ад былой хрустальнай вазы,
Нават ёсць і два алмазы,
Вунь блішчаць яны на сонцы
У гняздзе на самым донцы.

Тут з-за бору хмар нагнала —
І алмазаў тых не стала.
Выхваляка анямела,
Бо, відаць, не зразумела,
Што ў гняздо яе з галінкі
Проста ўпалі дзве расінкі.



## *ВЕПР У ЦЫРУЛЬНІ*

У бары пад гонкай хвойкай
Вепра падстрыгае сойка.

Паўтарае штохвіліны:
— Вось дзе карак! Вось дзе спіна!

— Сытна мне жывецца ўлетку:
Многа бульбы на палетку.

— Колькі хочаш, наядайся,
Ды ў гразі, брат, не качайся.

## *БЯРОЗКІ*

Світанне чырвонай палоскай
Прабілася ўдалечыні.
Зірнеш, а бярозкі за вёскай
Кудысьці бягуць з цішыні.

Між поля, паўз рэчку і плёсы
То ўроссып, то гуртам бягуць.

Туман прападае бялёсы,
І хмаркі над імі плывуць.

Бярозкі, як быццам дзяўчынкі,
У лета бягуць, за смугу.
Зялёныя толькі хусцінкі
Ад ветру шумяць на бягу.



## *ВЕРАБ'І*

Расстараўся верабейка
Чарвяка ў калюзе нейкай.

Са здабычай прылятае.
— Дзе дастаў? — сусед пытае.

— На лужку за нашай хатай
Тлусценькіх такіх багата.

— Палічыў ты іх як быццам!
Чарвякі ж маглі прысніцца.

— Палічу, калі не верыш,—
Кажа верабейка шэры.

Чарвяка ў гняздзе пакінуў
І — хутчэй на лугавіну.

Прыляцеў назад імкліва,
Азірнуўся палахліва:

— Дзе чарвяк мой дзеўся тлусты?
На лужку і праўда пуста.

— Я ж казаў,— сусед узвіўся,—
Што чарвяк табе прысніўся!

## *КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ*

— Лясы, лугі, у дымцы хаты —
Усё ў нас ёсць, мы ўсім багаты,—
Гарачым днём на жніўным полі
Гаворыць дзед унучцы Волі.—
Карысных выкапняў нямала
Я назаву, каб ты іх знала.
— Не трэба, дзед! — смяецца ўнучка.—
То — бульба, рэпа, морква, бручка...



## *ЗАРНІЦЫ*

Пад вечар заціхлі крыніцы
І пошум няпужаных крыл.
З-за цёмных пагоркаў зарніцы
Асветляць начны небасхіл.

Зямля пасля дзённае спёкі
Сыходзіць да ранку цяплом.
За сіняй маланкай далёкі
Адразу пачуецца гром.

Над нівай, туманам спавітай,
Паблісквае ўвесь далягляд.
Зарніцы — на лён і на жыта!
Зарніцы — на лес і на сад!

Пейзаж у святле незвычайным
Ужо навальніцай прапах.
Быць, значыць, палям ураджайным,
Быць, значыць, грыбам у лясах.



## СПЁКА

Які спякотны сёння дзень!
Хаваецца індык у цень.

Да спёкі Шарык не прывык,
Аж высалапіў свой язык.

Нікуды Шарык не бяжыць —
Сядзіць ля будкі і дрыжыць.

Наадварот, суседскі кот
Яшчэ вышэй залез на плот.

Крычыць адтуль: — Гэй, рыжы пёс,
Ты да мяне, брат, не дарос!

— Ага, малы,— сказаў індык.—
І мне ж паказвае язык.



## *КУРЫЦА*

Зярнят наеўшыся дасыта,
Ваду п'е курыца з карыта.

Яна такую звычку мае:
Як п'е, дык голаў задзірае.

Зірнула гусь — загагатала,
А курыца прасакатала:

— Ваду не пракаўтнула б горла,
Калі б я голаў не задзёрла.

## *УПАРТЫЯ ЯРШЫ*

Чарвяка, што жыў у іле,
Два яршы ў абед злавілі.

Меншы ёрш, звідна галодны,
Чарвяка дзяліць не згодны.

Каб наесціся самому,
Грозіць большы ёрш малому:

— Шчупака, відаць, паклічу
Ды яму аддам здабычу.

— Ну і кліч — сабе ж на гора,—
Кажа меншы ёрш бадзёра.—

Як цябе ён будзе есці,
Я паспею ў іл залезці.



## *АКВАРЫУМ*

У пакоі ля сцяны
Вадаём стаіць шкляны —

Сонечны, нібы крышталь,
Ані бур няма, ні хваль.

Мірна плаваюць у ім
Рыбкі, дробныя зусім,—

Тэлескоп, хамелеон,
Сомік, барбус і неон.

Ім давай без лішніх слоў
Інфузорый і рачкоў.

Любяць свежую яду,
Любяць чыстую ваду

Тэлескоп, хамелеон,
Сомік, барбус і неон.

Вось які прынеслі ў дом
Незвычайны вадаём.



## *КУКУРУЗА*

На палетку нават ранкам
Не сціхае калыханка.

У лісці, як немаўляткі,
Дрэмлюць круглыя пачаткі.

Развяваюцца чубочкі.
Праразаюцца зубочкі.

Даль рыжэе палявая —
Кукуруза паспявае.

## АКУНЬ

На кручку чарвяк спусціўся
Ледзь не ў пашчу акуню.
— Ты адкуль? — акунь здзівіўся.—
Не ўцякай, бо даганю.
Чарвяка крануў губамі,
Той — уверх, акунь — услед.
Ціха стала ў цёмнай яме —
Знік акунь, няма ў абед.
Лінь сказаў: — Во смеху будзе,
Як не зловіць чарвяка.
Рак сказаў: — Даўно на блюдзе
Твой акунь у рыбака.



## ВЕТЛІВЫЯ СУСЕДЗІ

Днём халодным у адведкі
Крочыць бусел да суседкі.

Чапля доўга частавала
Ды праводзіць госця стала.

Пастаялі ля бярозы.
На вачах у чаплі слёзы.

— Ты не жалься! — кажа бусел.—
Я нідзе не заблуджуся.

Госцю пад бярозай светлай
Адказала чапля ветла:

— Кроч спакойна ў сваю нетру —
Слёзы ж у мяне ад ветру.



## *КАНЕЦ ЛЕТА*

Жнівень прайшоў ураджайны.
Дымна затлелі кастры.
Там, дзе гудзелі камбайны,
Сёння гудуць трактары.

Травы і жыта скасілі,
Склалі ў стагі і тарпы.
Ластаўкі зноў абляпілі
І правады, і слупы.

Сохне бульбоўнік на плоце.
Вылет апошні ў пчалы.
Сумна крычаць на балоце,
Чуючы слоту, буслы.



## *ВАВЁРЧЫНЫ ЗУБКІ*

Вавёрка арэхі
Нясе прадаваць.
Сама іх пагрызла б,
Ды зубкі баляць.

Суседка пачула
Пра зубкі яе —
Арэхі сяброўцы
Свае аддае:

— Мяшочак і мой
Занясі на базар...
Як зубкі баляць,
То ўцалее тавар.

## *ПРАЦАВІТЫ ВОЖЫК*

Заўжды спяшае ён кудысьці —
То ловіць мыш, то носіць лісце.

Як бег у верасе па росах,
Павісла кропелька ля носа.

Жаўна крычыць: — Ты ж прастудзіўся!
На момант вожык прыпыніўся:

— Дык то ж і ў холад, і ў спякоту
Вісіць ля носа кропля поту.



## *ТРУТНІ*

У вуллі на рамках кутніх
Дрэмлюць усё лета трутні.

Енчыць узялі за моду:
— Дайце мёду! Дайце мёду!



Потым з раніцы да ночы
Папракаюць пчол рабочых:

— Малачком сваім спачатку
Нас карміце, а не матку!

Ды аднойчы ў дзень асенні
Кончылася ў пчол цярпенне.

Узяліся пчолы ў бокі:
— Пачакайце ж, абібокі!

Крылцы ў трутняў пазгрызалі
І з вулля на двор прагналі.

## *ПЕРАДЗІМ'Е*

Заслалі хмары неба просінь,
Зліняў і гай барвовы.
На завадзях астылых восень
Звяркоў загнала ў сховы.

Зямля, прыціхлая ад стомы,
Туманамі спавіта.
Спяшаецца да сцірт саломы
Казуль пужлівых світа.

У стыні ранішняй каліны
Гараць чырвоным жарам.
Праплыў даўно клін жураўліны
Над палявым абшарам.

Куляюцца сняжынкі з неба,
І заміраюць гукі,
І доўга-доўга пахнуць хлебам
Зямля, і лес, і рукі.



## *ДАЎГАВУХІ ЗАЙЧЫК*

Блізкі подых завірухі.
Плача зайчык даўгавухі:

— Памарожу, мусіць, лапкі.
Хто мне ў краме купіць тапкі?

Тата з мамай каля стога
Супакойваюць малога:

— Купім заўтра табе боты —
Будзеш бегаць праз сумёты.

Ды не плач — вазьмі хусцінку,
Вытры слёзкі, мілы сынку.

Усміхнуўся зайчык маме:
— Слёзкі выцер я вушамі.



## *КОЦІК І КЛУБОЧАК*

Бабка вяжа рукавіцы.
Коцік скача па святліцы.

Рыжы коціцца клубочак
То пад ложак, то ў куточак.

Бабка быццам і драмала,
Ды клубочак разматала —

Рукавіцы выйшлі дзеду...
Сумна коціку з абеду.

Слёзкі ў коціка на вочках —
Так яму шкада клубочка.

## *СЕВА І ДРЭВА*

У снезе нос і чубчык рыжы —
То Сева аб'язджае лыжы.

Смяецца сонца ў кронах саду,
Злуецца брат у Севы ззаду:

— Чаго кійкамі так махаеш?
Зачэпіш дрэва — паламаеш!

— Дык што рабіць,— пытае Сева,—
Калі на кожным кроку — дрэва?



## *ДОБРЫ СНЕГАВІК*

***Жарт***

Каля вербаў белакосых
Снегавік стаіць бязносы.

З вербаў каркаюць вароны:
— Дзе ты дзеў свой нос чырвоны?

Азірнуўшыся на поплаў,
Снегавік прамовіў цёпла:

— З морквы нос мой старамодны
З'еў са смакам зай галодны.



## АМЯЛА І АМЯЛУШКІ

Хоць мяцеліца мяла,
Пры дарозе
Зелянела амяла
На бярозе.
Вунь паміж галін густых
Тое дзіва:
Як шары, вісяць кусты
Сіратліва.
То для птахаў амяла
Згаладнелых
Шмат ад лета зберагла
Ягад белых.
Іх з нязнанае пары
Любяць птушкі —
Верабейкі, снегіры,
Амялушкі.
Вось чародкаю ляцяць
Верабейкі:
Мусіць, хочуць паспытаць
Ягад клейкіх.
Снегіры за імі ўслед
Падлятаюць.

«Не спазніцца б на абед», —
Разважаюць.
Прыляцелі і глядзяць
Сумна птушкі:
На бярозе ўжо сядзяць
Амялушкі.
Сакавітыя плады
Падзяўбаны —
Прачынацца ў халады
Трэба рана.
Амялушак амяла
Пакарміла...
А мяцеліца мяла
І круціла.



## *У ЗІМОВЫМ ЛЕСЕ*

Ціха-ціхутка
Дрэмлюць паляны.
Коўдрай бялюткай
Долы засланы.

Заяц пад хвойкай
Спаў гэтак міла,
Ледзь яго сойка
Ранкам збудзіла.

З боку балота
Кралася ліска —
Мыш у сумёты
Шуснула з піскам.

Спелую шышку
Лушчыць вавёрка.
Воўк у зацішку
З'ехаў з пагорка.

Лес абудзіўся
Рыкам ласіным.
Клён пахіліўся.
Мерзнуць асіны.

Даль барвавее.
Ціш азалела.
Белай завеяй
Ноч адшумела.



## ЗМЕСТ


Жабіны канцэрты — 3
Малочны туман — 4
Яшчарка — 4
Лясныя парасяты — 5
Пралескі — 6
Мудры воран — 7
Жураўліны «будзільнік» — 7
Палёт шчупака — 8
Змяя і вожык — 9
Сокал — 10
Хітры ліс — 11
Ласі — 12
Бусел і каня — 12
Крыўда асаедаў — 13
Пугач — 14
Сараканожка — 15
Шура і куры — 15
Анюціны кветкі — 16
Гусачок — 16
Леў — 17
Зайчыкавы ноты — 18
У лясным магазіне — 18
Хворы коцік — 19
Каза — 20
Зай, які лічыў варон — 21
Мурашыныя кароўкі — 22
Кажан — 23
Глушцовыя прысмакі — 24
У гасцях — 24
Цярплівы певень — 25
Чарапаха — 26
Сарочына багацце — 27
Вепр у цырульні — 28
Бярозкі — 28
Вераб'і — 29
Карысныя выкапні — 30
Зарніцы — 31
Спёка — 32
Курыца — 33
Упартыя яршы — 33
Акварыум — 34
Кукуруза — 35
Акунь — 36
Ветлівыя суседзі — 36
Канец лета — 37
Вавёрчыны зубкі — 38
Працавіты вожык — 39
Трутні — 39
Передзім'е — 40
Даўгавухі зайчык — 41
Коцік і клубочак — 42
Сева і дрэва — 42
Добры снегавік — 43
Амяла і амялушкі — 44
У зімовым лесе — 45

Издание для детей и юношества

**ГОРДЕЙ Виктор Константинович**

**ЗАЙЧИК,
КОТОРЫЙ СЧИТАЛ
ВОРОН**

**Стихи, небылицы,
потешки**

Для дошкольного возраста

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Выданне для дзяцей і юнацтва

**ГАРДЗЕЙ Віктар Канстанцінавіч**

**ЗАЙ,
ЯКІ ЛІЧЫЎ
ВАРОН**

**Вершы, небыліцы,
пацешкі**

Мастацкі рэдактар Ю. Ц. Цярэшчанка
Тэхнічны рэдактар Н. П. Дасаева
Карэктар Д. Р. Лосік

ІБ № 1548

Здадзена ў набор 04.06.90. Падпісана да друку 26.10.90. Фармат $60 \times 90^1/_{16}$. Папера афс. № 2. Гарнітура Звычайная новая. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 3,0. Ум. фарб.-адб. 12,50. Ул.-выд. арк. 1,81. Тыраж 80 000 экз. Зак. 524. Цана 50 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20.

Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.


50 к.